Настаўніцкая газета, 22, 25, 27 лістапада 2014 г.

# ІМІ ГАНАРЫЦЦА БДПУ

(20—21 лістапада 2014 г. – 100-годдзе Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М.Танка).

Самы галоўны гонар БДПУ- яго выпускнікі. У першую чаргу, гэта тысячы настаўнікаў, якія плённа працавалі і працуюць у гарадах і вёсках рэспублікі у школах, ліцэях, гімназіях, педаганічных каледжах. Многія з іх прызнаны лепшымі “Настаўнікамі года”, ушанаваны ордэнамі і медалямі, ганаровымі званнямі “Заслужаны настаўнік Беларусі”, “Народны настаўнік СССР”, “Герой Сацыялістычнай працы”.

Мала каму вядома, што ў 1935-1955 гадах пры Мінскім педінстытуце існаваў Мінскі настаўніцкі інстытут (з 1947 года працаваў у Маладзечна). Ён рыхтаваў настаўнікаў для 5-7-х класаў агульнаадукацыйных школ. Тэрмін навучанная 2 гады. Пагэтаму ў нас ёсць усе падставы для таго, каб выпускнікоў Мінскага настаўніцкага інстытута лічыць выпускнікамі МДПІ і адпаведна БДПУ.

Вядомы культуролаг і гісторык, доктар культуралогіі, прафесар ***Аляксандр Іванавіч Смолік*** скончыў гістарычны факультэт МДПІ у 1968 годзе. Ён прайшоў шлях ад выкладчыка да дэкана факультэта давузаўскай падрыхтоўкі МДПІ, а потым да прарэктара па навучальнай рабоце (з 1992 года) і першага прарэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (з 1999-года). З 2006 года А.І.Смолік працаваў загадчыкам кафедры гісторыі Беларусі і музеезнаўства БДУКМ, а з 2009 года з’яўляецца загадчыкам кафедры культуралогіі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў.

Выпускніца літаратурна-музычнага факультэта МДПІ імя М.Горкага 1969 года ***Ядвіга Дамінікаўна Грыгаровіч*** стала доктарам педагагіных навук, прафесарам, рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, членам-карэспандэнтам Беларускай акадэміі адукацыі, ганаровым прафесарам Шлёнскага ўніверсітэта (1994, Польшча).

Свой нарыс аб выпускніках БДПУ я хачу закончыць словамі з даклада рэктара БДПУ, доктара педагагічных навук, прафесара Аляксандра Іванвіча Жука на сходзе працоўнага калектывў ўніверсітэта у верасні гэтага года:

“Паважаныя калегі! Стагоддзе БДПУ – наш залаты юбілей. Мы падыходзім да яго са слаўнай гісторыяй і дасягненнямі. Нам ёсць чым ганарыцца. Аднак час дынамічны. Ён дыктуе неабходнасць новых падыходаў і хуткага рэагавання на адпаведныя змены ў соцыуме. Таму будучае ўніверсітэта – у яго няспынным развіцці. Упэўнены, што нашаму калектыву па сілах дастойна выканаць сваю важную культурна-гістарычную місію па падрыхтоўцы нацыянальных педагагічных кадраў”.

Эмануіл Рыгоравіч Іофе, прафесар БДПУ імя М.Танка, доктар гістарычных навук

220005, г.Мінск, пр.Незалежнасці,39-90.Т.2-84-83-79 (х.)